

**5 верасня 2021 года – 120 гадоў з дня нараджэння Віталя Вольскага, беларускага пісьменніка.**

Віталь Фрыдрыхавіч Вольскі-Зэйдэль нарадзіўся 5 верасня 1901 г. у г. Пецярбургу ў сям'і служачага. Атрымаў добрую адукацыю ў гімназіі, ведаў 5-6 моў. З 1918 г. працаваў на заводзе. З 1919 г. у Чырвонай арміі, удзельнічаў у Грамадзянскай вайне на Заходнім фронце, дайшоў да Варшавы. Хацеў заняцца літаратурнай творчасцю, таму звольніўся са службы.

Беларускае друкаванае слова Віталю Вольскаму трапіла ў рукі ў 1920 г., а першым вершам па-беларуску быў верш Якуба Коласа «Нёман», першай кнігай — зборнік вершаў Максіма Багдановіча «Вянок» (1917). Вельмі захапіўся беларускай мовай, пачаў збіраць фальклор. Скончыў Камуністычны ўніверсітэт імя У. І. Леніна (1927). Шмат працаваў, часта выступаў у рабочых клубах, на розных дыспутах, на абмеркаваннях мастацкіх выставак і тэатральных спектакляў.

Працаваў на розных пасадах ва ўстановах культуры і адукацыі Беларусі. У 1932–1936 гг. — дырэктар Інстытута літаратуры і мастацтва Акадэміі навук БССР. Кандыдат філалагічных навук (1934). У час Вялікай Айчыннай вайны жыў у Маскве, працаваў у газетах, часопісе «Беларусь». У 1948–1954 гг. — навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры АН БССР.

Літаратурную дзейнасць Віталь Вольскі пачаў у 1926 г. Даследаваў народную творчасць і старажытную рукапісную літаратуру беларускіх татараў — кітабы. Аўтар п'ес для дзяцей: «Цудоўная дудка» (1938), «Дзед і жораў» (1939), «Несцерка» (1940), «Машэка» (1946). Напісаў сцэнарыі дакументальна-краязнаўчых фільмаў «Белавежская пушча» (1946), «Бярэзінскі запаведнік» (1965). У розныя гады п'есы В. Вольскага паспяхова ставіліся на сцэне нават за мяжой — у Балгарыі, Германіі, Польшчы, Манголіі, Кітаі.

Пісьменнік аб’ездзіў усе запаведныя куткі Беларусі, пабываў у афрыканскіх і арабскіх краінах, у Францыі, Швецыі і інш. У 1961 г. пабываў у Заходняй Афрыцы — Сенегал, Гвінея, Бераг Слановай Косці. Напісаў кнігі мастацка-краязнаўчых нарысаў і апавяданняў «Па лясных сцежках» (1948), «У лясах над Бярозай» (1955), «Чайкі над Нараччу» (1959), «Падарожжа па краіне беларусаў» (1968), «Кніга падарожжаў» (1971), «Дзень добры, Бяроза!» (1984) і інш.. За любоў да прыроды Віталя Вольскага называлі «беларускім Прышвіным».

Віталь Фрыдрыхавіч, пражыўшы доўгае жыццё, не страціў прагі да пазнання свету, захаваў бадзёрасць, аптымізм, жаданне творча працаваць.

В. Ф. Вольскі-Зэйдэль узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», медалямі. Заслужаны дзеяч культуры БССР (1971). Памёр 22 жніўня 1988 г.



**30 верасня 2021 года −90 год з дня нараджэння Ніла Гілевіча, паэта, перакладчыка, празаіка, драматурга, публіцыста, народнага паэта Беларусі.**

Ніл Сымонавіч Гілевіч нарадзіўся 30 верасня 1931 г. у вёсцы Слабада Лагойскага раёна Мінскай вобласці. У першыя пасляваенныя гады працаваў калгасным паштальёнам. Любоў да роднай мовы, жаданне авалодаць багацейшымі скарбамі літаратуры і сказаць у ёй сваё паэтычнае слова прывялі будучага пісьменніка спачатку ў Мінскае педагагічнае вучылішча, а затым на філалагічны факультэт БДУ.

Упершыню ў друку з вершамі выступіў у 1946 г. Аўтар кніг паэзіі «Песня ў дарогу» (1957), «Прадвесне ідзе па зямлі» (1959), «Неспакой» (1961), «Бальшак» (1965), «Перазовы» (1967), «Лісце трыпутніку» (1968), «А дзе ж тая крынічанька» (1972), «Запаветнае» (1975), «Актавы» (1976), «У добрай згодзе» (1979), «Святлынь» (1984), «Родныя дзеці» (1985), «Як дрэва карэннем» (1986), «Повязь» (1987), «Талісман», «На высокім алтары», «Вечны матыў» (усе — 1994), «…І плямы на табе няма», «Сказ пра Лысую гару» (абедзве — 2003), «На флейце самоты» (2004), «Замова ад страху» (2009) і інш. У 1980 г. выйшаў зборнік п’ес «Начлег на буслянцы».

Аўтар кніг па літаратуразнаўстве і фалькларыстыцы «Акрыленая рэвалюцыяй» (1962), «Наша родная песня» (1968), «Паэтыка беларускай народнай лірыкі» (1975), «Паэтыка беларускіх загадак» (1976), «Мой белы дзень» (1992) і інш. Укладальнік і навуковы рэдактар фальклорных зборнікаў «Песні сямі вёсак» (1973), «Лірычныя песні» (1976), «Лірыка беларускага вяселля» (1979), «Народныя казкі, байкі, апавяданні і мудраслоўі» (1983).

Выдаў зборнікі артыкулаў «У гэта веру» (1978), «Удзячнасць і абавязак» (1982), «Покліч жыцця і часу» (1983), «Годнасць, сумленнасць, мужнасць» (1988), «Вяртанне і працяг» (1990), «Любоў прасветлая» (1996), «Толькі мы

самі» (2005). Напісаў аўтабіяграфічную аповесць «Перажыўшы вайну» (1988). Памяці жонкі Ніны Іванаўны прысвечана кніга «Добры анёл беларускасці» (2007). Працаваў у галіне перакладу.
Дзецям адрасаваў паэтычныя зборнікі «Зялёны востраў» (1963), «Дождж-грыбасей» (1966), «Загадкі» (1971), «Добры чалавек» (1987), «Шчаслівыя хвіліны» (2001). Асобнай кнігай выйшла аповесць «Разумная дзевачка» (2005). У 2003—2013 гг. выйшаў Збор твораў у 23 тамах.
Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, медалём Ф. Скарыны, балгарскім ордэнам Кірыла і Мяфодзія I ступені, ордэнам Югаслаўскай зоркі са стужкай, украінскім ордэнам князя Яраслава Мудрага III ступені і інш.
Памёр 29 сакавіка 2016 года ў Мінску.